

**САЛОМКА Анастасія,**
вучаніца 10 класа
ДУА «Гародзькаўскі НПК
дзіцячы сад–сярэдняя школа»
Валожынскага раёна.

Тэма: ***«Настаўнік XXI стагоддзя. Які ён?»***

**Настаўнік... Няма такой другой прафесіі, якую б не называлі самымі прыгожымі словамі: высакародная, пачэсная, цудоўная...**

**Настаўнік не можа быць нікім іншым. Для яго школа – гэта жыццё.**

**Настаўнік – гэта не толькі прызванне, гэта яшчэ і асаблівая душа. Гэта той чалавек, які робіць наша жыццё лепшым, больш добрым і светлым...**

**Кожны дзень ён ідзе ў адны і тыя ж класы адной і той жа сцяжынкай, пратаптанай уздоўж школьнай сцяны. Паўсядзённыя задачы настаўніка – урокі, кантрольныя работы, праверка сшыткаў.**

**Настаўнік – гэта прафесія ад Бога, а ўсе астатнія прафесіі – ад настаўніка. Гэта сапраўды так. Каб не было настаўніка, то не было б вучоных, выдатных людзей, а разам з імі – розных адкрыццяў. Не было б і многіх іншых прафесій: ні ўрача, ні будаўніка, ні пекара, ні хлебароба... Няма такога чалавека, у якога б не было настаўніка. Падмурак усяму закладвае менавіта ён.**

**Мне прафесія настаўніка вядома вельмі добра, бо мая сям'я – гэта некалькі пакаленняў педагогаў. З самага дзяцінства ў маім доме адчуваецца школьная атмасфера – сшыткі, падручнікі, канспекты... Гэта ўсё таму, што мая мама – настаўніца рускай мовы і літаратуры. Яна выбрала прафесію**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

педагога, каб працягнуць справу сваіх бацькоў, якія аддалі большую частку свайго жыцця адукацыі і выхаванню дзяцей.

Сёння школа – складаны комплекс. Настаўніку неабходна адпавядаць сучаснасці. Яго майстэрства, неабыякавасць да ўсіх з'яў жыцця адыгрываюць вельмі значную ролю ў справе выхавання і навучання падрастаючага пакалення.

Дзеці перш за ўсё звяртаюць увагу на тое, наколькі яркай і неардынарнай асобай з'яўляецца настаўнік. Сучасны педагог – гэта чалавек, які пастаянна знаходзіцца ў творчых пошуках. Яго задача – навучыць дзяцей мысліць, разважаць, адстойваць сваю думку. А самае галоўнае – любіць і паважаць сваіх вучняў.

Настаўнік у наш час павінен не толькі вучыць дзяцей, але і сам вучыцца ў сваіх вучняў. Гэта прафесіянал, які валодае комплексам якасцей. Ён і артыст, і мастак, і спявак, і паэт...

Настаўніцкая сціпласць – неад'емны складнік гэтай прафесіі. Сціплы, уважлівы, далікатны педагог – вось той ідэал, на які сёння арыентуецца моладзь.

Для таго, каб настаўнік стаў цікавым для вучняў, ён павінен быць непасрэдным, крэатыўным і мець сваю жыццёвую пазіцыю.

Давер – тонкая рэч. І асаблівую значнасць яна набывае тады, калі закранае ўзаемаадносіны паміж вучнем і педагогам. Для таго каб дзеці пачалі давяраць, настаўнік павінен лічыцца з іх інтарэсамі.

Свет вельмі хутка развіваецца. Зараз ідзе вялікая плынь інфармацыі з інтэрнэту, чаго раней не было. Дзеці ўжо з маленства ўмеюць карыстацца гаджэтамі. Мы, канешне, марым пра тое, каб нашы настаўнікі валодалі ўменнем асвойваць разнастайныя тэхнічныя навукі. Свет стаў мабільным, таму хочацца, каб урокі былі інтэрактыўнымі, з прымяненнем мультымедыйных сродкаў і інтэрнэту.

Сучасны настаўнік ніколі не павінен спыняцца на дасягнутым. Ён мусіць ісці наперад, бо педагог – гэта крыніца бязмежнай творчасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ